УДК 32.001

# ЭКСПЕРЫМЕНТАЛЬНАЯ ПРАГРАМА АЛЬБО ЭКСПЕРЫМЕНТ З ПАЛІТАЛОГІЯЙ

**Галубовіч В.У., Старавойтава І.Л.**
УА “Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт”
г. Гродна, Рэспубіка Беларусь

Няма падставаў для сцвярджэння, што айчынная сістэма вышэйшай школы дасягнула самых вяршыняў дасканаласці і не патрабуе навацыяў. Больш таго, настойванне на такой думцы можа азначаць ненаўмыснае прызнанне вычарпанасці сучаснай адукацыйнай мадэлі і кантатацыю яе крызісу. Кожны грамадскі інстытут, у тым ліку адукацыйны сектар, павінен няспынна шукаць новыя формы працы, а гэта магчыма толькі пры ўмовах аўтаномнасці, наяўнасці прасторы для дзейнасці і пэўнай сістэмы каардынат. Ва ўніверсітэтах такой сістэмай з’яўляецца тыпавы адукацыйны стандарт, які праграмуе неабходны мінімум ведаў па тым ці іншым прадмеце. Да зменаў патрабаванняў праграмы можна ставіцца па-рознаму, але выконваць іх выкладчыкі абавязаныя, толькі змены гэтыя выглядаюць часам своеасаблівым “танцам смерці”.

За апошнія дзесяцігоддзі ў вышэйшых установах краіны выкладаліся самыя розныя дысцыпліны гуманітарнага профілю. Некаторыя шчасліва адыйшлі ў нябыт, іншыя прыжыліся і сталі асновай гуманітарнага адукацыйнага блока. Да ліку апошніх адносілася і “Паліталогія”. Працяглы вопыт выкладання яе ў беларускіх ВНУ запатрабаваў з’яўленне прафесійных кадраў выкладчыкаў, дазволіў сфармаваць уласную айчынную вучэбна-метадычную базу, што ўзняла ўзровень падрыхтоўкі студэнтаў. Практыка выкладання наспрыяла выпрацоўцы аптымальнага аб’ёма вучэбных гадзін, неабходных для якаснага засваення дысцыпліны. Несумненна, былі і праблемы, звязаныя са стандартызацыяй вучэбнай інфармацыі, распрацоўкай новых дапаможнікаў. Перыяд росту быў плённым і падрыхтаваў добрую глебу для далейшага ўдасканалення.

Якасныя змены не прымусілі сябе чакаць, толькі вынік іх ажыццяўлення можа стаць катастрафічным для паліталагічнай часткі адукацыі нашага студэнцтва. Уведзеная з 2012-2013 гг. навучальнага года эксперыментальная праграма “інтэграванага модуля для ўстановаў вышэйшай адукацыі” фактычна руйнуе ўвесь назапашаны досвед выкладання “Паліталогіі” у ВНУ краіны. Скарачэнне лекцыйных і практычных заняткаў, а на іх адпаведна новай праграме выпадае 8 і 10 гадзін, не дазваліць закрануць і паловы ад агульнага аб’ёму матэрыяла, які быў абавязковы раней.

Табліца 1 - Фрагмент тэматычнага плана па модулю “Паліталогія” паводле эксперыментальнай праграмы

| № | Тэма | л | с |
|---|---|---|---|
| 1(4) | Тэорыя і метадалогія палітычнай навукі | 2 | 4 |
| 2(5) | Палітычныя інстытуты ў Рэспубліцы Беларусь і сучасным свеце | 2 | 2 |
| 3(6) | Палітычныя працэсы ў рэспубліцы Беларусь і сучасным свеце | 2 | 2 |
| 4(7) | Міжнародныя адносіны і знешняя палітыка дзяржаў | 2 | 2 |



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

Нават калі на кожны асобны занятак вылучаць новую тэму, то курс "Паліталогіі" усцяж не будзе выглядаць паўнавартасным. Тэарэтычны матэрыял звычайна замацоўваецца на практыцы, а час на гэта, паводле новага стандарта, проста не прадугледжваецца. Паколькі ж трэба ахапіць максімум пытанняў, на семінарах прыходзіцца разбіраць толькі тыя з іх, якія студэнты вымушаныя вывучаць самастойна. Але, як вядома, чакаць ад самастойнай працы студэнтаў значных вынікаў, асабліва на першым курсе і ў першым семестры, на які выпадае вывучэнне "Паліталогіі", увогуле не прыходзіцца. Такі падыход да аптымізацыі выклікае здзіўленне, як і парушэнне логікі самога эксперыменту. Эксперымент павінен апрабавацца ў невялікіх памерах і толькі пасля станоўчых вынікаў тыражавацца. Дзе і калі эксперыментальная праграма паказала свае несумненныя перавагі? Хто павінен маніторыць вынікі ўсеўніверсітэцкага эксперымента з гуманітарнымі навукамі? І самае істотнае – вопыт павінен нечым скончыцца, але, чаго чакаюць эксперыментатары, не зразумела. Увогуле ствараецца ўражанне, што вопыт завочнай адукацыі – двух-трохтыднёвы рывок да ведаў – становіцца адзіным і безальтэрнатыўным узорам удасканалення нашай адукацыі.

Змены ў змесце і аб'ёме выкладаемага матэрыяла непазбежна прывядуць да негатыўных наступстваў. Сучаснае студэнцтва – асноўная крыніца фармавання эліты беларускага грамадства, у тым ліку яго кіроўнай часкі. *Эксперыментальная* "Паліталогія", якая нагадвае скарочаны "курс маладога байца" ва ўмовах вайсковага часу, ператварае грунтоўную падрыхтоўку грамадзяніна ў кропкавае азнаямленне з абранымі праблемамі палітычнай навукі.

ЛІТАРАТУРА

1. Политология : типовая учеб. программа для высш. учеб. заведений / сост. : Н.П. Денисюк, В.А. Мельник, С.В. Решетников; под ред. С.В. Решетникова. Минск: РИВШ, 2008. – 32 с.
2. Политология. Экспериментальная учебная программа интегрированного модуля для учреждений высшего образования на 2012-2013 учебный год. Минск, 2012. 18 с. (электронный вариант).

УДК 811.16

## СПЕЦИФИКА ПРЕПОДАВАНИЯ ПРОФЕССИОНАЛЬНОЙ ЛЕКСИКИ ДЛЯ ИНОСТРАННЫХ СТУДЕНТОВ, ОБУЧАЮЩИХСЯ НА ЭКОНОМИЧЕСКИХ ФАКУЛЬТЕТАХ

**Голубович О.П.**
УО "Гродненский государственный аграрный университет"
г. Гродно, Республика Беларусь

Русский как второй государственный язык Республики Беларусь играет всё более важную роль в образовательном пространстве нашей страны. Развитие интеграционных тенденций в рамках Содружества Независимых Государств и рост влияния Российской Федерации в общемировом масштабе содействует интересу к русскому языку, повышает его коммуникативную значимость. В последние годы наметилась тенденция увеличения числа иностранных



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ